мере не осведомлены о проведении публичных торгов, несмотря на то, что информация о предстоящих аукционах размещается на официальных сайтах соответствующих исполнительных комитетов, а также на сайте Госкомимущества, публикуется в газете «Звязда», вследствие чего причиной несостоявшихся аукционов является неявка покупателей. Поэтому в Республике Беларусь необходимо урегулировать данную проблему, что повысит интерес физических и юридических лиц к земельным аукционам и обеспечит достаточный уровень конкуренции.

Однако, несмотря на все перечисленные проблемы, в Республике Беларусь существуют большие перспективы для успешного внедрения и развития продажи земель на конкурентных началах, что, в свою очередь, приведет к более активному формированию рынка земли.

***Д.Г. Дзямідчык***
БДЭУ (Мінск)

## КАНЦЭПЦЫЯ АДВЕЧНАГА ШЛЯХУ БЕЛАРУСАЎ У ТВОРЧАЙ СПАДЧЫНЕ І. АБДЗІРАЛОВІЧА «АДВЕЧНЫМ ШЛЯХАМ»

І. Абдзіраловіч займае асаблівае месца у палітычнай і прававой думцы Беларусі 20-х гг. XX ст. Яго магутныя ідэі нацыянальнай свядомасці, тоеснасці, адэкватнасці беларускага народу актуальны і ў цяперашні час.

Эсэ І. Абдзіраловіча «Адвечным шляхам» паўстае ў часы пераацэнкі каштоўнасцей і грамадска-палітычных пераўтварэнняў на Беларусі. «Адвечны шлях» разглядаецца як адзін з архетыпаў, што злучае мінуласць і будучыню нацыі, мае позірк, звернуты наперад, да яе ідэалаў. Выходзячы з нашай гісторыі, з падзей і ўплываў на яе ход іншых цывілізацый, І. Абдзіраловіч выяўляў Беларусь як мяжу паміж Усходам і Захадам, як цэнтр сутыкнення геапалітычных і эканамічных інтарэсаў суседніх дзяржаў. Ён заклікаў беларусаў шукаць свой шлях развіцця і на Захадзе, і на Усходзе, браць і выкарыстоўваць лепшае, што стваралі абодва культурныя кірункі, а разам з тым, ён папярэджваў: пазбаўляйцеся тых крайнасцяў, адмоўных рыс, якія існуюць у кожнай з цывілізацый. І. Абдзіраловіч робіць вынік, што «адвечны шлях» нельга стварыць, на яго можна толькі вярнуцца і не выходзіць з яго. Доказам таму шматвекавая гісторыя: толькі тыя асобы, што не аддавалі пераваг ніводнаму з бакоў, ужывалі ў сваёй дзейнасці і творчасці набыткі і заходніх і ўсходніх краін, рабіліся нацыянальнымі героямі ці геніямі — Усяслаў Чарадзей, Ф. Скарына, А. Міцкевіч. Праводзячы паралель з сучаснасцю, варта падкрэсліць наступнае. Пасля набыцця самастойнасці ў 90-х гг. перад Рэспублікай Беларусь асабліва актуальна паўстала пытанне: захаванне суверэннасці і наладжванне трывалых

узаемаадносін з краінамі Захаду і Расіяй. Тыя прапановы, што акрэсліў І. Абдзіраловіч, знайшлі практычнае прымяненне ў сучаснай шматвектарнай палітыцы Рэспублікі Беларусь.

У сваім творы аўтар разважае над паняццем «форма». Ён сцвярджае, што формы жыцця замест таго, каб служыць чалавеку, маюць сілу валадаць над ім, сціскаючы і затрымліваючы яго духоўныя імкненні. Формы жыцця, нагадваў І. Абдзіраловіч, творыць народ, асабісты чалавек. Чалавецтва стварае розныя формы жыцця ад сям'і да дзяржавы. Але з цягам часу, калі яны «мяртвеюць», то пачынаюць сціскаць, душыць нашу свабоду асоб. Замест таго, каб служыць чалавеку ў яго жыццёвых патрэбах, форма пачынае кіраваць чалавекам, заціскаючы сваёй уладай праўдзівае чалавечае жыццё. І. Абдзіраловіч быў упэўнены, што патрэбна ліючаяся, зменная форма, заўсёды адпаведная жыццёвым праявам. Беларускі мысліцель быццам прыадкрыў шыльду будучыні і сурочыў распад СССР, які ператварыўся з цягам часу у «мёртвую» форму чалавечага жыцця. Думка І. Абдзіраловіча аб тым, што адзінай падставаю грамадскай творчасці беларускага народа з'яўляецца суверэнная дзяржава, бо «пад чужацкім панаваннем мы ахвяраваны на дэградацыю», знайшла сваё адлюстраванне пры пабудове самастойнай і незалежнай Рэспублікі Беларусь. Канстытуцыя 1994 г. арт. 27 зацвердзіла наступнае: забеспячэнне правоў і свабод грамадзян з'яўляецца найвышэйшай мэтай дзяржавы. Такім чынам, дзяржава — гэта такая ўстанова, у якой кожная асоба мае магчымасць актыўна развівацца, адчуваць сябе забяспечанай і тварыць. Сапраўднай падставай жыцця, паводле І. Абдзіраловіча, можа быць толькі творчасць. Творчасць на кожным кроку: у штодзённай працы, ў сямейных адносінах, грамадзянскім руху. Толькі тады жыццё не будзе сціскаць форма, і чалавек здаволіць сваё прыроднае імкненне быць тварцом. «Творачы — зруйнуем».

Такім чынам, беларускі народ у канцы мінулага стагоддзя, у сувязі з абвяшчэннем дзяржаўнага суверэнітэту, атрымаў магчымасць вярнуцца на свой «адвечны шлях».

***С.Ю. Денис***

Академия управления при Президенте Республики Беларусь (Минск)

# СУДЬБА ИНСТИТУТА ПРИДАНОГО В ЧАСТНОМ ПРАВЕ

Семья в древнейший период римской истории представляет тип промежуточной, патриархальной семьи, объединявшей под властью главы семьи (paterfamilias) жену, детей, других родственников, кабальных, а также рабов. Имущественные отношения супругов различались в зависимости от формы заключения брака. При заключении брака с властью мужа (cum manu) все имущество жены переходило к мужу.



Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Бібліятэка.
Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.
Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by